0157300010

The Ministry of culture of the Republic of Belarus

Regulation

November 23, 2017 - #72

Minsk

Reçu CLT / CIH / ITH
Le 27 MAR. 2019
N° 0175

On the conferring of historical and cultural value status and category

Under sub-item 1.2 of item 1 of Article 93 and sub-item 4.2 of item 4 of Article 96 of the Culture Code of the Republic of Belarus, paragraph 2 sub-item 5:13, item 5 of the Regulation on the Ministry of Culture, approved by the Council of Ministers of the Republic of Belarus of January 17, 2017 №40 "Issues of the Ministry of Culture" Ministry of culture of the Republic of Belarus DECREES:

Conferring of historical and cultural value status and category "A" for intangible manifestations of human creativity:

“Wedding tradition with the customs "in Dubrovno district, Vitebsk region;

The traditional dish "Dumpling with souls" in Vitebsk region "on the territory of the Braslav, Verkhnedvinsk, Glubokoye, Dokshitsky, Lepel, Miory, Ushachsky, Chashniki, Sharkovshchina districts;

“Forest tree beekeeping in Belarus as exemplified by Lelchitsy district of Homiel region” (Lelchitsy district, Homiel region).

The Minister U.P. Bondar

МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

# ПАСТАНОВА

# ПОСТАНОВЛЕНИЕ

23 лістапада 2017 № 72

г. Мінск

г. Минск

Аб наданні статусу і катэгорыі
гісторыка-культурнай каштоўнасці

На падставе падпункта 1.2 пункта 1 артыкула 93 і падпункта 4.2 пункта 4 артыкула 96 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, абзаца другога падпункта 5.13 пункта 5 Палажэння аб Міністэрстве культуры, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 студзеня 2017 г. № 40 “Вопросы Министерства культуры”, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Надаць статус гісторыка-культурнай каштоўнасці і катэгорыю “А” нематэрыяльным праяўленням творчасці чалавека:

“Традыцыя вяселля са звычаямі” ў Дубровенскім раёне Віцебскай вобласці;

“Традыцыйная страва “Клёцкі з “душамі” Віцебскай вобласці” на тэрыторыі Браслаўскага, Верхнядзвінскага, Глыбоцкага, Докшыцкага, Лепельскага, Міёрскага, Ушацкага, Чашніцкага, Шаркаўшчынскага раёнаў;

“Лясное бортніцтва Беларусі на прыкладзе Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці” (Лельчыцкі раён Гомельскай вобласці).

Міністр Ю.П.Бондар

Зак. 393.






## Inventory

Search    Region: Select region    District: Select district

### Forest tree beekeeping in Belarus

Cipher (in the State list): **33AK000112**

Date inclusion: **23.11.2017**

№ Protocol Rada: **Пратакол пасяджэння Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны ад 15.11.2017 № 11-01-01/12. Пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 23.11.2017 № 72 / Minutes of the meeting of the National Council of Historical and Cultural Heritage of 15.11.2017 № 11-01-01/12. Resolution of the Council of Ministers of the Republic of Belarus from 23.11.2017 № 72**

Cipher (in inventory): **НКС-180222/1**

**Name:**

Forest tree beekeeping in Belarus

**The second item name ICH (adopted in a particular community, the local version):**

Tree beekeeping, Honey hunting

**Corresponding to (s) Community (s), group (s) or individual (s) described:**

The community concerned with forest tree beekeeping traditions comprises all generations of tree beekeepers. Among them are practicioners, who directly participate in the tree beekeeping process, and those, who helping them and studuing this practice as well as craftsmen who are engage in the production of special facilities which needed for beekeeping. As a rule old masters provides teaching for young people and transmit special knoweledge and skills. Men from 18 years old and over are practicing; teenagers and children are helping and studying, women are broadening the practice by other aspects ( traditional medicine and cuisine concerned). Community often comprises entire families, or groups and individuals. Some public institutions (administration and staff of forestries (ranger stations), nature reserves, local centres of cultures) are also engaged, as well as non-governmental organizations such as Brotherhood of Barefooted Tree Beekeepers, Tree Beekeepers' Brotherhood from Dzebri, and the representatives of other communities that are indirectly related to the practice through the specific work (forestry, traditional medecine, cuisine, candle production, etc), or by the personal interest

**Habitat:**






**Gomel region » Lelchitsy district » Lelčycy district Homiel region;**

**Short description:**

Forest tree beekeeping is an ancient forest-based practice, the initial form of cultural beekeeping. It is based on breeding and keeping forest bees (Baroŭka) in artificial hollows (tree-hive). This practice has evolved from honey gathering from a wild bee, when a man accidentally, later intentionally (the hunt for honey) used forest bees for collecting honey. As an independent forest craft, tree beekeeping passed three stages of development: the protection and care of wild bees found in the hollows; protection and care of living swarm in tree-hives made into living trees; breeding and keeping swarm within a specially made log-hive putet on the height of minimum 3 mt. Forest tree beekeeping includes a wide-range of skills and practices which relate not only to the craft (care for bees and collecting honey). Forest tree beekeeping also is based on a great respect for natural environment, mantaining of the ecological ballance and practically sacral attitude to a bee associated with the God's. Tree-beekeepers visit they hives only few times a year. The honey collecting is always in Autumn, traditionally after the Navity of the Blessed Virgin Mary (8th September), only small amount of honey can be collected, rest should stay for the bees. It's also a believe that only a righteous and honest man could keep the bees

▼ Identification and description

etymologically traced to the common Slavic linguistic unity). The transition to the classical form of tree beekeeping occurred with the advent of iron tools, when it became possible hollowing tree-hive in damp tree trunks; its peak reached from 10th to 12th centuries.From the late 17th century as a result of massive felling of forests for sale, for plowing for industrial purposes began the decline of tree beekeeping, and in the first half of the 19th century it has lost its former economic importance and gave place to tree beekeeping.In a separate, clean relict cases, tree beekeeping has survived to the present day. Such relict craft preserved in the "live" view on the territory of UbarckajePalessie (Lelčycy district, Homiel region). From the 14th century in the Belarusian cities and towns was professional tree beekeeping associations with broad rights of self-government.Their activities were regulated by the Statute approved by the city CouncilThe statutes of the Grand Duchy of Lithuania legally enshrines the rights of tree beekeepers. Tree beekeepers of Lelčycy district are not united by any union or other public organizations engaged in this craft in her spare time and consider it as their sacred duty to keep the traditions of their ancestors.In the forests you can still see the old deck, made only with an axe which 100 years or more.Young and old tree beekeepers work together, they help wives, and children from childhood to observe, gradually accustomed to help tree beekeepers who climb a tree.It's a risky thing, because sometimes it takes 20 meters to climb, which requires dexterity, training, observance of certain rules and tools

**Language or dialect used:**

Despite the fact that the distribution of the tradition of Forest tree beekeeping covers almost all the woodland, you can talk about the difference in the terms beekeeping (dialect type) — it's Eastern and Western Paliessie speech. Professional vocabulary which is used tree beekeepers of Lelčycy district, has its own characteristics Eastern woodland speech in its local variants (almost every village has such features), which is reflected in our dictionary, compiled on the basis of interviews with tree beekeepers. Dictionary attached

**Material objects that are associated with the practice of the element:**

Tree beekeepers produce, use and store special tools (rope – 'leziva'; long hisel – 'pieshnia'; axe – 'barta; linden box – 'lazbien' etc.)

**Other intangible elements associated with the practice of the element:**

The custom to take with you into the woods bread on a towel and leave it under the tree while working on care of bees.Family rites associated with the use of honey and candles: baptisms, weddings, funerals, and the custom of remembrance of ancestors.Candlemas – winter meeting with the summer

**Transmission model element in the community:**

Today, like many years ago the transmission of the ICH element takes place in the tree beekeepers families, from generation to generation in the process of common activity as a form of social pedagogics. The model provides for long-term assimilation of knowledge and practical skills through training by bearers of tradition during common work process. The knowledge and skills related to this practice also transmit within relevant rural communities, through common rituals, mutual cooperation, local forms of communication. There are different form of informal education in the community where ICH bearers act as trainers for community members who are interested in this craft. There are so-called secondary forms of the ICH transmitting -- recovery studies which occur on the basis of the analysis of the existed form of tree beekeeping ( using special literature, documentary souses, photos, films), as well as directly from the bearers of traditions and skills, the old tree beekeepers, who are storing the

eritage.by/nks/7191/

я ▪ Навіны ▪ Каляндар падзей ▪ Рэсурсы ▪ ЮНЕСКА ▪ Інвентар НКС ▪ Публікацыі ▪ Галерэ

НКС > Традыцыйныя рамёствы

ар НКС

Пошук Вобласць: Выберыце вобласць Раён: Выберыце раён

бортніцтва Беларусі

Дзяржаўным спісе): **33АК000112**

ючэння: **23/11/2017**

кола Рады: **Пратакол пасяджэння Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка**
**най спадчыны ад 15.11.2017 № 11-01-01/12. Пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 23.11.2017 №**
**of the meeting of the National Council of Historical and Cultural Heritage of 15.11.2017 № 11-01-01/12. Resolution of t**
**of Ministers of the Republic of Belarus from 23.11.2017 № 72**

Інвентары): **НКС-180222/1**

кі аб адказнасці адносна НКС

енне элементаў НКС

фікацыя і апісанне элемента

вые словы

лежнасць да спісаў ЮНЕСКА

енты, звязаныя з элементам

іксацыя

іксацыя



ртніцтва на Палессі..mp4



bortniki sbor.mp4

**of the Republic of Belarus from 23.11.2017 № 72**

Cipher (in inventory): **НКС-180222/1**

▼ Identifying the elements of the ICH

▼ Identification and description

▼ Keywords

▼ Included in the list of UNESCO

▼ Documents

▼ Photo



▼ Video



**Бортнік глядзіць пчол і забірае лішку сот з мёдам, які кладзе ў лазьбень – праца адбываецца на вышыні каля 8 метраў_IMG_1889.jpg**

Слайд-шоу:

▼ Ключавыя словы

▼ Прыналежнасць да спісаў ЮНЕСКА

▼ Дакументы, звязаныя з элементам

▼ Фотафіксацыя



eritage.by/nks/7191/

я ▪ Навіны ▪ Каляндар падзей ▪ Рэсурсы ▪ ЮНЕСКА ▪ Інвентар НКС ▪ Публікацыі ▪ Галерэ

НКС > Традыцыйныя рамёствы

## ар НКС

Пошук  Вобласць: Выберыце вобласць  Раён: Выберыце раён

### бортніцтва Беларусі

Дзяржаўным спісе): **33АК000112**

ючэння: **23/11/2017**

кола Рады: **Пратакол пасяджэння Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторык**
**іай спадчыны ад 15.11.2017 № 11-01-01/12. Пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 23.11.2017 №**
**of the meeting of the National Council of Historical and Cultural Heritage of 15.11.2017 № 11-01-01/12. Resolution of t**
**of Ministers of the Republic of Belarus from 23.11.2017 № 72**

Інвентары): **НКС-180222/1**

і аб адказнасці адносна НКС

енне элементаў НКС

фікацыя і апісанне элемента

вые словы

лежнасць да спісаў ЮНЕСКА

енты, звязаныя з элементам

іксацыя

іксацыя



ртніцтва на Палессі..mp4



bortniki sbor.mp4

▼ Identification and description

▼ Keywords

▼ Included in the list of UNESCO

▼ Documents

▼ Photo

▼ Video



**Бортніцтва на Палессі..mp4**



**bortniki sbor.mp4**

інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны

- Выканальніцкія мастацтвы
- Вусныя традыцыі і формы выражэння
- Светапогляд людзей, міфалогія
- Традыцыйныя рамёствы
- Традыцыйная ежа
- Практыкі захавання
- Традыцыйныя цырымоніі




Галоўная ▪ Навіны ▪ Каляндар падзей ▪ Рэсурсы ▪ ЮНЕСКА ▪ Інвентар НКС ▪ Публікацыі ▪ Галерэя ▪

Інвентар НКС > Традыцыйныя рамёствы

## Інвентар НКС

Пошук | Вобласць: Выберыце вобласць | Раён: Выберыце раён

### Лясное бортніцтва Беларусі

Шыфр (у Дзяржаўным спісе): **33АК000112**

Дата ўключэння: **23/11/2017**

№ пратакола Рады: **Пратакол пасяджэння Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны ад 15.11.2017 № 11-01-01/12. Пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 23.11.2017 № 72 / Minutes of the meeting of the National Council of Historical and Cultural Heritage of 15.11.2017 № 11-01-01/12. Resolution of the Council of Ministers of the Republic of Belarus from 23.11.2017 № 72**

Шыфр (у Інвентары): **НКС-180222/1**

▾ Звесткі аб адказнасці адносна НКС

**Назва:**

Лясное бортніцтва Беларусі

**Другая назва элемента НКС (прынятая ў канкрэтнай супольнасці, лакальны варыянт):**

Пчалярства, пчольніцтва, гляець пчолы, глядзець пчолы, мець пчолы ў лесе, мець калоды ў лесе, даглядаць пчолы, займацца пчоламі

**Адпаведная(ыя) супольнасць(і), група(ы) альбо індывідуум(мы):**

Найперш – жыхары Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці: н.п. Баравое, Букча, Глушкавічы, Грабяні, Данілевічы, Дзяржынск, Дубніцкае, Дуброва, Заброддзе, Замошша, Іванава Слабада, Картынічы, Лельчыцы, Маркоўскае, Новае Палессе, Прыбалавічы, Рудніцча, Рудня, Сіманічы, Сіманіцкі Млынок, Стадолічы, Сярэднія Печы, Тонеж, Тонежская Рудня. Па падліках сельсаветаў Лельчыцкага раёна тут больш за 100 бортнікаў, аднак, як паказваюць экспедыцыйныя матэрыялы, іх значна больш. Многія з бортнікаў не афішыруюць свой занятак. Бортніцтвам таксама займаюцца жыхары Столінскага (н.п. Цераблічы, Аздамічы, Мачуль), Брэсцкага (н.п. Прыбарава, Селяхі, Медна) і Пінскага раёнаў Брэсцкай вобласці, Петрыкаўскага, Ельскага, Мазырскага і некаторых іншых раёнаў Гомельскай вобласці. Асобныя бортнікі ёсць на Гродзеншчыне, Міншчыне і Браслаўшчыне

**Арэол распаўсюджвання:**



**Кароткае апісанне элемента:**

Бортніцтва — старадаўні лясны промысел, пачатковая форма культурнага пчалярства. Заснавана на развядзенні і ўтрыманні лясных пчол (баровак) у штучных дуплах — борцях. Развілося з дзікага пчалярства (збіральніцтва), калі чалавек выпадкова, а пазней свядома (паляванне за мёдам) знаходзіў пчаліныя гнёзды ў дуплах дрэў, знішчаў агнём пчол і збіраў мёд. Як самастойны від ляснога промыслу бортніцтва прайшло тры этапы развіцця: ахова і догляд дзікіх пчол у знойдзеных дуплах, свядомае ўтрыманне аселенага рою ў прыстасаваных пад борці натуральных дуплах, развядзенне і ўтрыманне рою ў спецыяльна зробленых борцях. У найбольш архаічным варыянце гэты промысел захаваўся на тэрыторыі Убарцкага Палесся, дзе па сённяшні дзень існуе яго перадача з пакалення ў пакаленне. На гэтай тэрыторыі па сённяшні дзень пражывае больш за 100 бортнікаў, якія практыкуюць гэтую практыку пастаянна. Лясное бортніцтва ўяўляе сабой шырокі пласт навыкаў і практык, якія датычацца толькі гэтага промыслу; бортнікі захоўваюць і выкарыстоўваюць адмысловыя прылады працы (лезіва, жэнь, пешня, барта). Промысел звязаны з паважлівым стаўленнем да акаляючай прыроды, пчол, пэўнымі традыцыямі і рытуаламі (бонда, сябрына, талака, замовы), захоўвае своеасаблівае звычаёвае права ўласнасці на бортнае дрэва, адметныя кулінарныя традыцыі, выкарыстанне пчол і прадуктаў пчалярства ў народнай медыцыне. Бортнікі карыстаюцца інструментамі і рыштункам, якія служылі яшчэ дзядам-прадзедам, а таксама традыцыйнай тэрміналогіяй. Сёння мясцовая супольнасць усведамляе неабходнасць захавання перанятага ад дзядоў-прадзедаў промыслу, сямейных традыцый (сакрэты рамяства традыцыйна перадаюцца ад дзеда да бацькі, ад бацькі да сына, ад дзеда да ўнука або ад вопытнага старога бортніка — да маладога спрытнага і фізічна моцнага сваяка ці ў крайнім выпадку суседа, калі няма каму перадаць навыкі), падтрымлівае і практыкуе настаўніцтва сярод маладых добраахвотнікаў сваёй вёскі, а таксама спрыяе распаўсюджванню ведаў пра промысел, лячэбныя ўласцівасці мёду і неабходнасць захавання экалагічнай раўнавагі

▾ Ідэнтыфікацыя і апісанне элемента

▾ Ключавыя словы

▾ Прыналежнасць да спісаў ЮНЕСКА

▾ Дакументы, звязаныя з элементам

▾ Фотафіксацыя

▾ Відэафіксацыя

**Катэгорыя элемента:**

Традыцыйныя рамёствы

**Веды і навыкі, якія могуць быць карыснымі і цікавымі сучасным спажыўцам:**

1) Веданне паводзін пчол, а таксама звяроў, птушак і насякомых, ласых на салодкі мёд і здольных пашкодзіць калоды-вуллі (мядзведзь, жаўна і дзяцел, куніца, мышы, мурашы), спосабы абароны пчол ад шкоднікаў; 2) Веды і навыкі, звязаныя з практыкамі мясцовых бортнікаў; 3) Выраб калоды для пчол метадам даўбення, скаблення; 4) Выбар мясцовасці ў лесе, дзе можна ўмацаваць новую калоду; 5) Тварэнне калоды — падрыхтоўка яе да прылёту рою, спосабы лекавання і прываблівання пчол; 6) Выраб рыштунку бортніка, звязанага з такімі старажытнымі рамёствамі, як кавальства, апрацоўка скуры і пляценне з яе лезіва і жзні; выраб кашалёў з сасновай дранкі і фанеры; выраб лазбеня з луба; дрэваапрацоўка (асабліва даўбёжнае рамяство) і выраб драўляных дэталяў рыштунку; галаўны ўбор бортніка і яго адзенне, якое абараняе яго ад укусаў пчол; 7) Веданне лекавых якасцей раслін, якія выкарыстоўваюцца падчас тварэння калоды; 8) Веды, звязаныя з народнай медыцынай на падставе мёду, воску, прополісу і іншых прадуктаў пчалярства; 9) Выкарыстанне мёду і воску ў традыцыйных абрадах і звычаях; 10) Навыкі — як узлазіць на дрэва з дапамогай спецыяльных прыстасаванняў (жзнь, лезіва) і замацоўвацца на вышыні для працы каля калоды на дрэве; 11) Веды па вырабу свечак з пчалінага воску; 12) Тапанімічныя і тэрміналагічныя веды, звязаныя з мясцовым бортніцтвам; 13) Прынцыпы звычаёвага права, якія тут існавалі спрадвеку і выкарыстоўваюцца зараз; 14) Правілы паводзін для прысутных на стойле падчас працы бортніка

**Актуальныя сацыяльныя і культурныя функцыі:**

Камунікатыўная функцыя (з'яўляецца формай калектыўнай памяці, якая транслірує досвед усталявання гармоніі паміж чалавекам і прыродай, адлюстроўвае эмацыянальную ацэнку гэтай практыкі мясцовай супольнасцю). Кансалідуючая функцыя (аб'ядноўвае мясцовыя супольнасці вакол агульнай дзейнасці; умацаванне роднасных сувязяў у практыцы перадачы традыцыі з пакалення ў пакаленне). Сацыялізуючая (падчас супольнай працы адбываецца сацыялізацыя асобных індывідуумаў). Каштоўнасная (промысел актуалізуе каштоўнасна-сэнсавы гарызонт мясцовай культуры ў форме лакальнай ідэнтычнасці). Функцыя тэмпаралізацыі культуры (промысел злучае ў адным сэнсавым кантэксце важныя этапы жыцця соцыуму і цыклы прыроды). Функцыя перадачы ведаў (захаванне разнастайных уменняў, навыкаў і звычаяў, звязаных з гэтым промыслам і прадуктамі пчалярства, якімі ўжо даўно не карыстаюцца іншыя; захаванне і пашырэнне ведаў пра паводзіны лясных насякомых, звяроў і птушак; веданне раслін, якія ўжываюцца для лекавання пчол — захаванне сакрэтаў рамяства; захаванне рэцэптаў народнай кулінарыі, дзе выкарыстоўваецца мёд; захаванне народных абрадаў, звычаяў, прыкмет, прыказак і прымавак, казак і анекдотаў, звязаных з пчалярствам і прадуктамі пчалярства, а таксама з асобамі бортнікаў і г.д.)

**Арганізацыі (няўрадавыя, грамадскія, дзяржаўныя), якія спрыяюць практыцы перадачы элемента:**

1) Мілашавіцкі лясгас падтрымлівае ўсіх бортнікаў у Лельчыцкім раёне, спрыяе тым работнікам лясгаса, якія займаюцца бортніцтвам, бо гэты лясны промысел садзейнічае захаванню пчол, а пчолы апыляюць многія расліны і садзейнічаюць захаванню экалогіі лесу. 2) Лясніцтвы, якія адносяцца да Нацыянальнага парку "Прыпяцкі", таксама садзейнічаюць тым працаўнікам, якія займаюцца бортніцтвам.

адбыўся са з'яўленнем жалезных прылад працы, калі стала магчымым выдзёўбваць борці ў сырых ствалах дрэў; свайго росквіту дасягнула ў X-XII стагоддзях. Мёд і воск былі галоўным відам экспарту. З канца XVII ст. у выніку масавых высечак лясоў на продаж, пад ворыва, для прамысловых мэт пачаўся занапад бортніцтва, а ў першай палове XIX стагоддзя яно страціла сваё ранейшае гаспадарчае значэнне і саступіла месца калоднаму пчалярству. У асобных, чыста рэліктавых выпадках, бортніцтва захавалася да нашых дзён (У.С. Гуркоў, С.Ф. Цярохін "Этнаграфія Беларусі", стар. 83-84). Такі рэліктавы промысел захаваўся на тэрыторыі Беларусі ў жывым бытаванні на тэрыторыі Убарцкага Палесся (Лельчыцкі раён Гомельскай вобласці). Тэхналогіі ўтрымання і догляду пчол, тэхніка вырабу борцей, бортных прылад і прыстасаванняў, посуду, сродкаў аховы пчол, выкарыстанне прадуктаў ляснога пчалярства разам з нормамі паводзін і звычаёвым правам перадаюцца тут з пакалення ў пакаленне ў сям'і і сельскай супольнасці. З XIV стагоддзя ў Беларусі ў гарадах і мястэчках былі карпаратыўна-прафесійныя аб'яднанні бортнікаў (бортныя цэхі) з шырокімі правамі самакіравання. Іх дзейнасць рэгламентавалася статутам, зацверджаным гарадской радай. Кожны цэх меў свой статут, пячатку, скарбонку, харугву з выявамі патрона пчалярства Іаана Златавуста, пчол і бортных рэалій. У вясковым асяроддзі існавалі мядовыя брацтвы. Статуты Вялікага Княства Літоўскага заканадаўча замацоўвалі правы пчаляроў. Зараз такога няма. Бортнікі Лельчыцкага раёна не аб'яднаныя ні ў якія саюзы ці іншыя грамадскія аб'яднанні, займаюцца гэтым промыслам у вольны ад працы час і разглядаюць яго як свой свяшчэнны абавязак захоўваць традыцыі продкаў. У лясах яшчэ можна ўбачыць старадаўнія калоды, зробленыя толькі сякерай і пяшнёй, якім 100 і больш гадоў, у многіх бортнікаў захоўваюцца інструменты і поўны рыштунак, неабходны для гэтай працы, выраблены іх дзядамі і прадзедамі, якія яны не толькі захоўваюць, але і карыстаюцца імі. Хоць і сталі выкарыстоўваць бензапілу для паскарэння і палягчэння працы па вырабу борцей, але дзяўбуць калоду пешняй, дапрацоўваюць склобачкай, каб падрыхтаваць належным чынам калоду для засялення роем пчол. Маладыя і старыя бортнікі працуюць разам, ім дапамагаюць жонкі, а дзеці змалку назіраюць, прывучаюцца пступова дапамагаць бортніку, які ўзлазіць на дрэва. Справа гэтая рызыкоўная, бо часам і на 20 метраў вышыні трэба ўзабрацца, што патрабуе спрыту, натрэніраванасці, захавання пэўных правілаў і прылад. Бортныя калоды перадаюць у спадчыну, даруюць на вяселле

**Стан бытавання:**

развіццё ці распаўсюджванне

**Апісанне залежнасці элемента ад традыцыйнага культурнага ландшафта, у якім існуе элемент:**

Ляснос бортніцтва ў першую чаргу залежыць ад навакольнага асяроддзя, наяўнасці лесу, лугу ці балоцістых мясцін. Дзейнасць бортніка скіравана на разумнае выкарыстанне лесу і яго багаццяў, на захаванне лесу і біялагічнай разнастайнасці ў ім — на карысць і здароўе прыроды і чалавека. Беражлівыя адносіны да лесу і боль за яго стан падчас стыхійных бедстваў, пажараў і нашэсцяў караеда ў апошнія гады сведчыць пра моцную прывязку бортнікаў да сваёй зямлі, лесу, да сваёй пчалярскай працы. Пэўныя правілы паводзін у гэтым прыродным асяроддзі заўсёды былі і застаюцца няпісаным законам для бортнікаў. Людзі, якія практыкуюць гэты промысел, аб'яднаныя гэтымі законамі і правамі (звычаёвае права), падпарадкоўваюцца ім, захоўваючы пэўнае сваё прафесійнае брацтва, дапамагаюць адзін аднаму. Яны захоўваюць веды і практыку мінулых пакаленняў, і гэта вельмі моцна трымаецца ў свядомасці жыхароў аддаленых ад цывілізацыі вёсак. Бортніцтва цесна звязана з сельскай гаспадаркай, бо пчала лятае ўсюды, дзе ёсць расліны, таму гэты промысел патрабуе ашчаднага вядзення сельскай гаспадаркі ў гэтых мясцінах. Хімічная апрацоўка палёў, пасадка рапсу і кукурузы адмоўна ўплываюць на жыццядзейнасць пчол і бортніцтва. Спрадвеку мужчыны-палешукі былі майстрамі на ўсе рукі, асабліва ў працы з дрэвам. Бортнік павінен валодаць многімі традыцыйнымі рамёствамі і засвойвае іх з дзяцінства: цяслярыць, апрацоўваць дрэва метадам даўбення, выкарыстоўваць кару і драўніну дзікарослых і садовых дрэў ў вырабе бортніцкага рыштунку, вырабляць

гісторыі пра бортнікаў. Асабліва трывала захоўваецца памяць пра бортнікаў і іх справу ў сям'і, бо праз гэта захоўваецца гісторыя роду, гісторыя вёскі, стан лясоў і акаляючага прыроднага асяроддзя ў розныя гістарычныя перыяды

**Мова альбо дыялекты, якія выкарыстоўваюцца:**

Улічваючы, што арэал распаўсюджвання традыцыі бортніцтва ахоплівае амаль усё Палессе, можна казаць пра розніцу ў тэрмінах бортніцтва (дыялектнага тыпу) — гэта ўсходне-палескія і заходне-палескія гаворкі. Прафесійная лексіка, якой карыстаюцца бортнікі Лельчыцкага раёна, мае свае асаблівасці ўсходне-палескай гаворкі ў яе лакальных варыянтах (амаль у кожнай вёсцы ёсць такія асаблівасці), што адлюстравана ў нашым слоўніку, складзеным на падставе інтэрв'ю з бортнікамі. Слоўнік прыкладаецца

**Матэрыяльныя аб'екты, якія звязаны з практыкай элемента:**

1) Дрэвы — цэльныя або хаутныя (з дуплом) — дуб або сасна для вырабу калоды; а таксама дуб, сасна, бяроза, ліпа, груша, якія пэўным чынам апрацоўваюцца пры вырабе драўляных частак інструментаў або драўлянага посуду, якім карыстаецца бортнік. Раней выкарыстоўвалі неапрацаваныя калоды, якія падвешвалі пад бортную калоду ў лесе, — для адпужвання мядзведзяў, а таксама ўзводзілі драўляныя памосты з дошак, у якія знізу забівалі вострыя калы. Такі памост ("одёр") меў люк, які бортнік адчыняў і ўзлазіў да бортнай калоды, не карыстаючыся жэнню або лезівам. 2) Бортнае дрэва — аб'ект уласнасці бортніка: дрэва, якое мае борць або на якім вісіць калода. 3) Борць — штучна зробленае або прыстасаванае натуральнае дупло ў старым дрэве. Борць мае пэўныя памеры і элементы (галава, подак). Борці размяшчаюцца на дрэве на вышыні ад 4 да 15 метраў (бывала і вышэй). 4) Калода (Стаяк, Ляжак) — кавалак дрэва да 2 метраў даўжыні з каморай у сярэдзіне і вузкай адтулінай прамавугольнай формы (доўж) для ўтрымання пчол. Калода звычайна вырабляецца з сасны або дуба і ўсталёўваецца на тоўстым дрэве (часцей на сасне або дубе). У тэхналагічным плане вырабу або тэрміналагічным не адрозніваецца ад борці — акрамя таго, што калоду можна перавезці ў іншае месца і ўсталяваць у любым месцы. Борць з'яўляецца часткай дрэва. Усталёўваецца калода на вышыні ад 4 да 20 метраў (можа быць ніжэй). 5) Кара бярозы для таго, каб пакрыць калоду ў лесе зверху. Цяпер яе накрываюць бляхай або дошкамі, прыціскаюць каменем. 6) Трухлявае дрэва (хаутная яго частка) для распальвання дымара або сухая смольная хаутная калодка для падкурвання. 7) Лекавыя расліны для адпужвання шкоднікаў і забеспячэння здароўя пчол: багон, галінкі крушыны, бярозы, лазы, мох для тварэння вуллёў. 8) Лазбень — ліпавы лубяны кораб з накрыўкай для ўтрымання мёду ў сотах падчас медазбору на дрэве. 9) Луб з ліпы і само ліпавае дрэва для вырабу лазбеня. 10) Сасновая дранка для вырабу кашалёў, якія шырока выкарыстоўваюцца на Палессі для розных гаспадарчых патрэб. 11) Інструменты, вырабленыя з жалеза і дрэва: сякера (тут кажуць "тапор", а раней выкарыстоўвалі шклюд), пешня (спецыяльнае долата, насаджанае на тоўстую доўгую ручку з патоўшчаным канцом — для апрацоўкі дрэва метадам даўбення), кебель для свідравання дзірак у дрэве, скобля (для выскаблівання), цяпер карыстаюцца бензапілой і шрубавёртам. 12) Сучасныя (нетрадыцыйныя) інструменты і прыстасаванні, якія сталі выкарыстоўвацца для паскарэння працы і былі недаступнымі раней: бензапіла, электрычныя свердлы і шрубавёрты, а таксама такія матэрыялы, як жалезныя цвікі, бляхі, кавалкі гумы, толь. 13) Астроў (острова) — адмыслова зробленыя драбіны з сукаватага дуба або сасны — для пад'ёму да першай галіны дрэва. 14) Жэнь і лезіва — спецыфічная прылада, уласцівая толькі ляснму бортніцтву. Гэта доўгая вяроўка ў асноўным 20-25 метраў (ёсць звесткі пра жэнь, якая была да 70 м даўжыні), якая выкарыстоўваецца для ўмацавання бортніка на дрэве каля калоды. Яна пляцецца (жэнь – касічкай, лезіва – укругавую) з палосак скуры буйной рагатай жывёлы — лася або каровы, быка (казалі, што былі і з мядзведзя). Некалі жэнь, якую захоўваюць многія бортнікі Убарцкага Палесся, была выраблена са скуры лася або каровы іх продкамі, і многія ёю карыстаюцца дагэтуль, калі яшчэ крэпкая. Калі

**Іншыя нематэрыяльныя элементы, звязаныя з практыкай элемента:**

Звычай браць з сабой у лес хлеб на рушніку і пакідаць яго пад дрэвам падчас працы па догляду пчол. Бонда – традыцыйны для Палесся абрад падзелу здабыткаў расліннага альбо жывёльнага тыпу. У лясным бортніцтве адбываецца падчас збору мёду, частуецца кожны сустрэчны ў лесе хлебам з мёдам, а таксама частуюцца сваякі, сябры і суседзі пасля медазбору. Талака — супольная праца блізкіх сваякоў, суседзяў, знаёмых у межах вёскі альбо цэлай ваколіцы. Талака — гэта цалкам бясплатная калектыўная праца, якая выконваецца па пэўнаму плану і мае пэўныя межы. У бортніцтве гэта выраб калод, зацягванне калоды на дрэва, падгляд за пчоламі старымі бортнікамі, у якіх няма памочнікаў, і іншыя справы бортніка. Абрады сямейныя, звязаныя з выкарыстаннем мёду і свечак: хрэсьбіны (бабіна каша з мёдам і свечкі ў царкве пры хрышчэнні), вяселле (абрад сукання вясельных свечак, абрад завівання наметкі з падмазваннем валасоў мёдам, частаванне мёдам маладых і іншае), пахаванне (памінальная кануна — каржы з мёдам і куцця - рыс з мёдам (раней пшаніца), які прыносяць у царкву і частуюць усіх, свечкі для нябожчыка і ў яго ў руках, свечкі пры пахаванні і адпяванні ва ўсіх прысутных), Дзяды і Бабы – звычай памінання продкаў (кануна, куцця), Посная куцця на Каляды. Раней былі абрады пераносу свечкі, але зараз захаваліся ў суседнім Столінскім раёне ў асяроддзі пчаляроў, якія сукаюць свечку раз на год, здзяйсняючы пэўны абрад па вырабу брацкай свячы. Братчыкі выпіваюць з адной пасудзіны па чарзе браціну – медавуху. Абрад называўся "перапіванне свечкі". Мядовыя брацтвы некалі існавалі шырока, засталіся рэлікты такіх звычаяў. Грамніцы або Стрэчанне – сустрэча зімы з летам і свята свечкі. Грамнічныя свечкі выкарыстоўваліся ўвесь год як абярог. А ў в. Новае Палессе Лельчыцкага раёна, ідучы з царквы з асвечанымі свечкамі, вадзілі карагоды, трымаючы гэтыя свечкі ў руках

**Мадэлі перадачы элемента ў супольнасці:**

Сёння існуюць дзве мадэлі перадачы элемента: 1) У межах сям'і з пакалення ў пакаленне. З'яўляецца часткай выхаваўчага працэсу. Мадэль прадугледжвае працяглы час засвойвання ведаў, навучання практычным навыкам ад носьбіта ў сумеснай працы. 2) У межах сельскай супольнасці (праз агульныя абрады, талаку, мясцовыя формы камунікацыі). Перадача ведаў і навыкаў непасрэдна ад носьбіта падчас настаўніцтва (у сумеснай працы). Другасныя формы традыцыі (аднаўленне, вывучэнне) адбываюцца на падставе аналізу этнаграфічнай спадчыны (праз літаратуру, дакументальныя фільмы), а таксама непасрэдна ад захавальнікаў жывой традыцыі, у некаторых выпадках — ад старых бортнікаў, якія захоўваюць інфармацыю ў памяці

**Пагрозы для існавання і перадачы элемента:**

Прыродна-кліматычныя праблемы Пажары, санітарная чыстка лесу (пры хваробе дрэваў), у выніку чаго адбываецца зніжэнне шчыльнасці і колькасці папуляцыі ад хвароб і дрэнных кліматычных умоў. Занесеныя хваробы пчол, інвазійныя пароды пчол, з-за чаго зніжаецца мясцовая папуляцыя і ўвогуле колькасць пчол. Сацыяльна-эканамічныя праблемы Вынішчэнне старых лясоў для патрэб дрэваапрацоўчай галіны, скарачэнне плошчы буйных лясных масіваў з-за няўстойлівай сельскагаспадарчай дзейнасці, развіццё прамысловасці (хімізацыя раслін). Выпадкі крадзяжоў пчол, бортных калод, мёду ў калодах нярэдкія, асабліва на памежных тэрыторыях. Рэжым памежнай паласы значна ўскладніў догляд пчол і калод бортнікамі, а неаднаразовыя крадзяжы (і выдзіранне) пчол з боку Украіны падчас вольнага знаходжання на тэрыторыі Беларусі ў час збору ягад негатыўна ўздзейнічаюць на далейшы занятак гэтым промыслам (калоды, размешчаныя ў памежнай паласе, належалі яшчэ дзеду або бацьку). Сацыялагічныя і дэмаграфічныя



Бортнік глядзіць пчол і забірае лішку сот з мёдам, які кладзе ў лазьбень – праца адбываецца на вышыні каля 8 метраў_IMG_1889.jpg

Слайд-шоу:

▼ Ключавыя словы

▼ Прыналежнасць да спісаў ЮНЕСКА

▼ Дакументы, звязаныя з элементам

▼ Фотафіксацыя



▼ Звесткі аб адказнасці адносна НКС

▼ Выяўленне элементаў НКС

▼ Ідэнтыфікацыя і апісанне элемента

▼ Ключавыя словы

▼ Прыналежнасць да спісаў ЮНЕСКА

▼ Дакументы, звязаныя з элементам

▼ Фотафіксацыя



▼ Відэафіксацыя

- Звесткі аб адказнасці адносна НКС
- Выяўленне элементаў НКС
- Ідэнтыфікацыя і апісанне элемента
- Ключавыя словы
- Прыналежнасць да спісаў ЮНЕСКА
- Дакументы, звязаныя з элементам
- Фотафіксацыя



- Відэафіксацыя